**ЛЕКСІКАЛОГІЯ** (ад грэч. *lexikos* «які адносіцца да слова, слоўнікавы» + *logos* «вучэнне») – раздзел мовазнаўства, у якім вывучаецца лексіка як сукупнасць слоў мовы.

Адрозніваюць агульную, прыватную (апісальную, або сінхранічную; гістарычную, або дыяхранічную; параўнальную), супастаўляльную лексікалогію.

**Агульная лексікалогія** вывучае заканамернасці функцыянавання слоў, уласцівыя для ўсіх моў. У рамках **прыватнай лексікалогіі** вылучаюць **апісальную**, або **сінхранічную**, **лексікалогію** (даследуе слоўнікавы склад мовы ў яго сучасным стане); **гістарычную**, або **дыяхранічную**, **лексікалогію** (вывучае гісторыю слоўнікавага складу мовы); **параўнальную лексікалогію** (выяўляе спецыфіку слоўнікавага складу роднасных моў, асаблівасці іх развіцця). **Супастаўляльная лексікалогія** апісвае агульныя і прыватныя лексічныя з'явы, уласцівыя не толькі роднасным, але і няроднасным мовам.

Лексікалогія звязана з навуковымі дысцыплінамі: семасіялогіяй, або семантыкай (ад грэч. «sēmasia» 'значэнне, сэнс' + «logos» 'вучэнне'; «sēmantikos» 'які абазначае') – навукай, якая вывучае значэнні слоў і змены значэнняў; этымалогіяй (ад грэч. «etymon» 'першапачатковае значэнне' + «logos» 'вучэнне') – навукай, якая высвятляе паходжанні слоў і наступныя стадыі іх развіцця; анамасіялогіяй (ад грэч. «onyma» 'імя' + «logos» 'вучэнне') – навукай, якая даследуе перадумовы і прычыны абазначэння прадметаў і з'яў адпаведнымі назвамі, анамастыкай (ад грэч. «onomasticos» 'які адносіцца да імені') – навукай, якая вывучае ўласныя імёны і геаграфічныя назвы. Анамастыка падзяляецца на: антрапаніміку (ад грэч. «antrо̃phos» 'чалавек' + «onyma» 'імя') – навуку, у якой разглядаюцца імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, псеўданімы і інш.; тапаніміку (ад грэч. «topos» 'мясцовасць' + «onyma» 'імя') – навуку, якая даследуе назвы геаграфічных аб'ектаў. Лексікалогія таксама звязана з дыялекталогіяй (ад грэч. «dialektos» 'гаворка' + «logos» 'вучэнне') – навукай, якая высвятляе словы пэўных гаворак; фразеалогіяй (ад грэч. «phrasis» 'выраз' + «logos» 'вучэнне') – навукай пра ўстойлівыя спалучэнні слоў; стылістыкай (ад грэч. «stylos» 'прылада пісьма ў старажытных грэкаў') – навукай, якая выяўляе сферу ўжывання слоў; лексікаграфіяй (ад грэч. «lexikos» 'слоўнікавы' + «graphо̃» 'пішу') – навукай, якая сістэматызуе словы і падае іх у выглядзе слоўнікаў.

Аб'ектам вывучэння лексікалогіі выступаюць не толькі асобныя адзінкі – словы, але і групоўкі. На падставе гэтага вылучаюцца лексіка-семантычная група (ЛСГ), семантычнае поле (СП), тэматычная група (ТГ).

**Лексіка-семантычная група** аб'ядноўвае словы з агульнай семантычнай прыметай (архісемай). Напрыклад, архісема 'маральныя якасці' яднае кампаненты ЛСГ «шчыры», «сумленны», «добразычлівы», «чуйны», «справядлівы», «далікатны» і інш.

**Семантычнае поле** складаецца з некалькіх ЛСГ, куды ўваходзяць словы розных часцін мовы. Так, семантычнае поле 'колер' аб'ядноўвае словы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«чырвоны», «чырвань», «чырванець», «чырвоненькі», «белы», «белізна», «бялець», «сіні», «сінь», «сінець» і інш.

**Тэматычнае поле** яднае словы на падставе агульнасці тэмы, дэнататыўнай суаднесенасці. Напрыклад, ‘кветка’: «ружа», «васілёк», «півоня», «нарцыс», «гваздзік» і інш.

*Т.Я.Старасценка*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ